**Sokrat Janowicz**

# Беларусь у чатырох канфесіях

Acta Polono-Ruthenica 2, 157-162

1997

Artykuł został zdigitalizowany i opracowany do udostępnienia w internecie przez Muzeum Historii Polski w ramach prac podejmowanych na rzecz zapewnienia otwartego, powszechnego i trwałego dostępu do polskiego dorobku naukowego i kulturalnego. Artykuł jest umieszczony w kolekcji cyfrowej bazhum.muzhp.pl, gromadzącej zawartość polskich czasopism humanistycznych i społecznych.

Tekst jest udostępniony do wykorzystania w ramach dozwolonego użytku.

MUZEUM HISTORII POLSKI

Sokrat Janowicz
Białystok - Krynki

# Беларусь у чатырох канфесіях

Шматканфесійнасць Беларусі ўнікальная ў Еўропе. У сучасны гістарычны момант грамадска істотныя ў ёй тры вялікія хрысціянскія веравызнанні: праваслаўе, рыма-каталіцызм, пратэстантызм. Дамінуючае некалі ўніяцтва цалкам элімінавана на працягу мінулага стагоддзя і сённячы знаходзіцца яно толькі ў пачатках свайго адраджэння, займаючы маргінальную пазіцыю, па колькасці вернікаў параўнаўчую са шматлікімі сектамі.

Гісторыя хрысціянскай рэлігіі ў Беларусі ў сэнсе часу ідэнтычная з дасягненнем еўрапейскага кантэксту ўсходнім славянствам. Вяжацца яна з узнікненнем на будучым беларускім арэале раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў: крывіцкага княства з цэнтрам у Полацку на Дзвіне, і дрыгавіцкага - з Туравам на Прыпяці. Няцяжка заўважыць, што абодва ўладанні сфармаваліся на важных адгалінаваннях старажытнага шляху „з варагаў у грэкі", на прычарнаморскай падставе якога здаўна сядзеў Кіеў на Дняпры. Адкуль было ўжо рукою падаць да элінскіх калоніяў на ўзбярэжжы і на Крыме.

Палаччане кантралявалі - дзвінскі працяг у Балтыйскае (Варагскае) мора, а тураўцы: прыпяцка-нёманскі з пярэвалакамі ў міжрэччы, ад якіх застаўся след у выглядзе назвы Ваўкавыска (тады: Волоковыеск).

Такое геапалітычнае становішча наклікала ўплывы адначасна ад візантыйскага ўсходу і ад лацінскага захаду. Перш паяўляліся тут купцы-хрысціяне, грэцкага або рымскага абрадаў. За імі або і разам з імі, несумненна, місіянеры. Да расколу хрысціянства ў 1054 годзе гэтыя сустрэчныя плыні не былі асабліва канфліктагеннымі, нягледзячы на вядомае хрышчэнне Кіева Уладзімірам. Польскае Каралеўства тым часам, апынуўшыся ў сферы нямецкага каталіцызму, востра змагалася з папярэдне пашыраным у ім кірыла-мяфодзіеўскім сла-

вянскім абрадам, які пранік з Мараваў у краіну віслянаў і далей.

Хоць каталіцкі кампанент у полацкай і тураўскай землях прачытваецца ў летапісных згадках, аднак яго паслейшая слабасць вынікала з чыста палітычных прычын. У Полацку ўкараняўся ён праз скандынаўскае пасрэдніцтва, натуральна, якое ў тую пару на нестабільным „варагскім беразе" не магло паслужыць моцным апірышчам. Болей зладжана націскалі палякі ўздоўж Прыпяці, але іх дынаміку тармазіла ўнутрыпольская міжусобіца, упадак адзінаўладдзя. Праваслаўе затое рэгулярна пульсавала з Візантыі. У супастаўленні з якою тадышні Рым пад германскім уладыцтвам уяўляў сабою правінцыйнае мястэчка сярод манументальных руінаў на вякі мінулай антычнасці.

Раскол фактычнай адзінаканфесійнасці старажытнай Беларусі - нязначнымі ў ёй калоніямі рымскага каталіцызму - адбыўся ў выніку рэалізацыі пастановаў т.зв. Крэўскай уніі. Ягайла абавязаўся хрысціянізаваць з дапамагаю польскіх ксяндзоў усю, падлеглую яму, балцка-варварскую стыхію: Жэмайтыю, Аўкштайтыю, і пасляяцвяжскія энклавы ў панёманскай Чорнай Русі. Гэтая акцыя не адразу парушыла праваслаўную кампактнасць старабеларускага насельніцтва. Сталася тое пасля, калі славянізацыя балтаў набыла размаху пад уздзеяннем цывілізацыйнага росту Вялікага княства Літоўскага. Беларускамоўе ахапіла забытую Яцвягію і, сягнуўшы за Вільню, глынула Аўкштайтыю. Тым не менш архіпелаг этнічных астраўкоў балтаў захоўваўся яшчэ доўга, галоўным чынам у ізаляваных ваколіцах Беларускага паазер'я і глухіх закутках Панямоння, таксама ў вярхоўях Нарвы. Акаталічаныя язычнікі парабіліся ліцьвінамі-беларусамі.

Каталіцызацыя вялікакняскай эліты, а затым і баярскай праслойкі праходзіла **не** пад простым націскам з боку польскіх вярхоў. Грунт пад яе падрыхтавала эканамічна-культурная перавага Польскага Каралеўства над Вялікім княствам Літоўскім, ад якое зарадзіўся працэс самапаланізацыі. На яго хвалі прыйшоў у Княства якраз пратэстантызм, які ў Польшчы ў залаты век, здавалася, быў блізкі перамогі. У тагачаснай Літве каталікі і праваслаўныя пры ўладзе знаходзіліся нярэдка ў маргінальнай меншыні. Калі адшчапенцу ад „рымскае веры" тыя лютарскія навіны не ўплывалі на яго ў тэмпах нейкага культуралагічнага шоку, дык „русінскаму" верніку

гэта не абыходзілася аднымі эмоцыямі і радасцямі адкрыцця праўды Хрыстовае. Ён пераходзіў з аднаго свету ў другі, ад паўсюднаў у царкве містыкі ў рацыяналізм кальвінскіх збораў. З малітоўнай лірыкі ў вучоныя дыспуты пра сутнасць Бога. З настрою царкоўнаславянскиих хvаралаў у польскамоўныя палемікі, у якіх лічыліся аргументы, а не эпітэты, паэзія.

У канчатковым рэзультаце - выхад з усходняга хрысціянства ў заходняе. Адсюль відавочная выснова, што ў перыяд жорсткай Контррэфармацi пасляправаслаўнаму пратэстанту аказаўся бліжэйшым касцёл, разумова і ментальна. Не дайшло б да татальнай каталіцызацыі потым без папярэдняй самапаланізацыі і захаплення пратэстанцтвам.

Асобнай праблемаю бачыцца царкоўная ўнія. Не паглыбляючыся ў яе прэгісторыю, трэба памятаць, што на фінальны 1596 год у Брэсце склаліся прычыны перш за ўсё міжнароднага характару. Да такога яднання імкнулася нядаўнім часам сама Візантыя, шукаючы падмогі Еўропы ў супрацьстаянні туркам. Затым - швед Ваза, што сеў на польскі трон, спрабоўваў вярнуць пад свой скіпетр не толькі Швецыю, што смутна яму адлучылася ад каталіцтва, але і рэалізаваць з дапамогаю патэнцыялу Рэчы Паспалітай (ад 1569 г.) даўнія планы Стакгольма заняць пануючае становішча на „всея Руси". У такім гістарычным кантэксце ініцыятыва праваслаўных уладыкаў, накіраваная на спомненую ўнію, падасца ўсяго непазбежнай пасьлядоўнасцю Люблінскай уніі, утварэння федэратыўнай дзяржавы. Знамянальна, што папскі энтузіязм да гэтай справы выразна астыў пасля фіяска польска-літоўскай інтэрвенцыі ў Маскоўшчыне і заснавання там дынастыі Раманавых. Стаўку роблена на Крэмль.

Некалі праваслаўную кампактнасць Беларусі змяніла каталіцкая, з той важкай розніцай, што двухабрадная, грэка-каталіцкая ў сваёй дэмаграфічнай пераважнасці. Адсунуўшы ў бок праваслаўе і пратэстантызм.

Тыповы каталіцкаму касцёлу дух місіянерства, экспансіі, падмацаванай удзелам у дзяржаўных структурах, усяляк спрыяў лацінізацыі ўніяцкай царквы, сціранню яе тоеснасці. Што те магло скончыцца дабром, пабуджаючы апазіцыйнасць сярод няпольскіх сваёй свядомасцю духоўнікаў на ўкраінскай і літоўскай Русі. Гэта вельмі аблягчыла царскаму ўраду ліквідацыю ўніяцтва ў 1839 г.

(уцалела выключна ў аўстрыйскай Галіччыне, планам Вены прыдатным).

Матрыца гістарычных падзей паказвае, што зорны час беларускаму этнасу выпаў на эпоху Вітаўта Вялікага. Нашмат раней, чымсьці суседняму польскаму, ці руска-маскоўскаму. У наступныя стагоддзі наглядаецца ўсё шпарчэйшы заняпад, хоць спачатку не так чытабельны, скажам: у дэкады Рэнесанса, кнігадрукавання. Кідкая ў вочы роля Польшчы ў гэтым працэсе дэгенерацыі ў асіміляцыю папраўдзе другарадная, на ўзроўні скуткаў ад прычыны. Няспынны рост магутнасці Масковіі, усё настойлівей канфрантуючай з Вялікім княствам Літоўскім, мусіла давесці да страты Вільняй партнёрскай раўназначнасці ў дачыненнях з Кракавам. Княства курчылася пад ударамі ад усходу і шукала паратунку ў свайго адзінапрастольнага саюзніка. На выгляд парадаксальна Расія такім чынам паланізавала і акаталічвала Белую Русь не даючы ёй шанцаў на самастойнасць (амаль лабараторны прыклад таго - гэта зніштажэнне падляшскіх уніятаў, напрыканцы XIX ст.).

Войны ў семнаццатым стагоддзі і жахлівая маскоўская акупацыя закончыліся для Беларусі татальнай катастрофаю: удвая паменшала лічба насельніцтва Вялікага княтсва Літоўскага і ўтрая - эканамічны патэнцыял (былі паветы, як Віцебскі, дзе ўцалела ўсяго няцэлыя дзве сотні чалавек). З таго часу беларуская Літва ўжо не паднялася з каленняў, дадаткова прыгнечаная рабункамі і генацыдам у Паўночную вайну. Аб'ектыўна Княства пераўтварылася ва ўнутраную калонію Польшчы. Разам з падзеламі Рэчы Паспалітай гэтую ролю пераняла Расія. Наш лёс умоўна назаву афрыканізацыяй Беларусі, што дазваляе з дапамогаю аднаго паняцця растлумачыць сутнасць нагаданае з'явы.

У такім стане - духоўным і матэрыяльным - беларусы ўваходзілі ў індустрыяльную эпоху, якая мала датычыла іх, і ў гвалтоўныя грамадскія змены ды рэвалюцыі, удзельнічаць у якіх як суб'ект не было ў іх аніякае эмогі. Прыклад Беларусі элементарна сведчыць, што мінулае фармуе будучае; заўтрашні дзень - гэта сённяшні з працягам у заўтра.

Агульнацывілізацыйныя з'явы ахопліваюць Беларусь у рытме рэха ад эпіцэнтра. Перыферыйна, у моц драматычнай яе адсталасці. Музеяфікуе маргіналізаваную за савецкімі часамі беларускую нацыя-

нальную культуру і - адначасна - адсоўвае на грамадскую абочыну застылае ў сваёй анахранічнасці, зніштажанае камуністамі, праваслаўе. Прымушаны ўладамі да атэізму народ шукае цяпер Бога не з дапамогаю акампраметаваных палітычнай карупцыяй уладыкаў, але пратэстанцкіх прапаведнікаў. Дынаміка паўторнага прыходу пратэстанцтва ў Беларусь, хоць і характарызуецца шматякімі падабенствамі да эпохі Рэнесанса, мае аднак дыяметральна розныя механізмы. Перш за ўсё пашыраецца яно ў простанароддзі і ў бліжэйшыя гады зойме дамінуючае становішча, адштурхоўваючы праваслаўе ў другараднасць (праграмна польскі каталіцызм застаецца без шанцаў на знач-насць у гэтай краіне). У чым атракцыйнасць пратэстантызму? У дапушчэнні чалавека да Бога, без пасрэдніцтва духоўнікаў, без бар'еру імперскіх рытуалаў і ўсяе магутнай арганізацыі накшталт Рыма ці Візантыі з вялікапанскай пышнасцю іерархаў. З'асяроджанне на адзінцы. Ва ўмовах гарадызацыі і непазбежнай альенацыі, калі паасобныя жыхары бытуюць у ананімнасці, без даўняе вясковай усёкантрольнасці, маральна-арганізацыйная дысцыплінаванасць царквы (касцёла) падлягае атамізацыі ў „адзінокім натоўпе" вялікагорада. Субардынуючы націск асяроддзя абмяжоўваецца сукватарантамі ад традыцыйнай макрамаштабнасці дапрамысловых грамадстваў рэдукуецца на практыцы да асабістага мікрасвету. З'яўленне ў ім - напрыклад - баптыста дае плён; духоўная глеба як быццам чакала такога зерня. Ты не марны пух у аграмадзіне царквы або касцёла. Ты важны Богу!

Пратэстанцкая канфесія ў сучаснай Беларусі не з'явілася раптам. У яе ўжо традыцыя з міжваення, галоўным чынам у паласе заходняга Палесся і паўднёвай Гарадзеншчыны. Даследванняў гэтай з'явы няма. Звязана яна, несуменна, з працоўнай эміграцыяй з тадышняй Польшчы ў ЗША і Канаду ў адначассі з руйнаваннем праваслаўя бальшавікамі ды ідэалагічным атэізмам тутэйшых грамадска-палітычных рухаў тае пары (напр. КПЗБ). У такой атмасферы мела месца эрупцыя ўсякіх сектаў у лоне царквы, класічнай ілюстрацыяй якіх ёсць дзейнасць прарока Ілы - селяніна Клімовіча з Грыбоўшчыны - фанатычныя прыхільнікі якога злічваліся дзесяткамі тысяч, ад Наваградчыны па Валынь і Беласток.

Хто ведае, ці не ў пратэстантызме шанц Беларусі на выратаванне. Гэта рэлігія працы, замест культу святкаванняў ды рытуаль-

насці. Гэтая канфесія не дала апусціцца ў савецкае гультайства, Эстоніі і Латвіі; добра спрыяе некаторым рэгіёнам Жэмайтыі ў Літоўскай Рэспубліцы. Еўрапейскі капіталізм пачаўся ў зоне пратэстантызму. Знамянальны анекдот: пратэстант нараджаецца, каб працаваць, а праваслаўны (каталік), каб святкаваць...

Канфесійная карусель Беларусі рушылася з праваслаўя ў паслейшае каталіцтва, каб запыніцца на пратэстанцкай дамінанце? Характэрная багатым народам рэлігійная індыферэнтнасць няхутка паявіцца ў ёй. Беларусь чакае яшчэ тое, што іншыя даўно ўжо маюць за сабою: барацьба за нацыянальнае адраджэнне і дзяржаўную незалежнасць. У меру яе развіцця і паглыблення, пратэстантызм дасягне свайго апагею тут, супроць русафільству царквы і паланафільству касцёла.

## Літаратура

1. М. Ермаловіч, *Старажытная Беларусь*, Мінск 1988.
2. М. Ермаловіч, *Вузел загадак*, „Полымя", 1989, nr 3.
3. *Этнаграфія Беларусі*, Мінск 1989.
4. Ю. Заяц, *Менская зямля: этапы фарміравання*, „Беларускі Гістарычны Часопіс", Мінск 1993, nr 4.
5. Л. Галяк, *Аб паходжаньні вялікіх князёў літоўскіх*, „Спадчына", Мінск 1993, nr 6.
6. Ю. Заяц, *Заславль в эпоху феодализма*, Мінск 1995.
7. *Іканапіс Беларусі*, Мінск 1992.
8. *Археалогія і нумізматыка Беларусі*, Мінск 1995.
9. С. Палуцкая, *Беларусь канца XVI - пачатку XVII ст. (напрамкі культурна-рэлігійнай арыентацыі)*, Мінск 1994.
10. Г. Сагановіч, *Невядомая вайна*, Мінск 1995.
11. *Беларусы: дэмаграфія, этнаграфія, дыяспара, канфесіі (атлас)*, Мінск 1996.